# Беларускаму універсітэту культуры

# 20 год!

## Юбілейны выпуск




## Чытайце ў нумары:

***Інтэрв'ю:***

*З рэктарам універсітэта ..... с.2*

*З першым рэктарам інстытута культуры ............. с.3*

*З прарэктарам па навуковай рабоце ...................... с.3*

*З дэканамі ............................... с.4-5*

***Гісторыя факультэтаў:***

*........................................ с.5-8*

*Дайджэст ................. с.7*

*Лірыка ........................ с.8*

* 20 * 20 * 20 * 20 * 20 * 20 * 20 * 20 * 20 * 20 * 20 * 20 * 20 *

# Адзіны на Беларусі

***Беларускі універсітэт культуры!***

***Адзіны ў краіне і непаўторны. Малады і мудры. Каму ж, як не яму, вывучаць і перадаваць нашчадкам багатую спадчыну беларускага народа? Каму ж, як не яму, захоўваць і распаўсюджваць тое духоўнае багацце, што стагоддзямі стваралася на Бацькаўшчыне таленавітымі навукоўцамі, пісьменнікамі, мастакамі, народнымі ўмельцамі?!***

***Жыве, працуе, набірае сілы Беларускі універсітэт культуры, што створаны на базе Мінскага інстытута культуры. Сёлета яму спаўняецца 20 год. Аб шляхах яго развіцця, аб яго поспехах і перспектывах распавядае рэктар сп. Ядвіга Дамінікаўна Грыгаровіч.***

Беларускі універсітэт культуры склаўся як самабытная навучальная ўстанова, якая сёння можа даць грунтоўную прафесійную падрыхтоўку будучым спецыялістам сацыяльна-культурнай сферы рэспублікі.

Універсітэцкае жыццё інтэнсіўна развіваецца, змяняюцца навучальныя планы і праграмы, укараняюцца новыя тэхналогіі і методыкі навучання, актывізуецца творчая дзейнасць студэнтаў. Сёння ў нас працуе 4 факультэты, на якіх вядзецца падрыхтоўка па 30 спецыяльнасцях і спецыялізацыях. Мы рыхтуем спецыялістаў па сусветнай і нацыянальнай мастацкай культуры, менеджмэнту сацыякультурнай дзейнасці, музейнай справе і ахове помнікаў культуры, народнай творчасці, харэаграфіі, розных жанрах мастацтва, літаратурнай рабоце, сацыяльнай педагогіцы, рэабілітацыі асобы сродкамі мастацтва ў постчарнобыльскі перыяд, бібліятэказнаўству, менеджмэнту і маркетынгу бібліятэчнай справы і інш.

Кафедры універсітэта праводзяць вялікую работу па вывучэнні, фіксацыі і аднаўленні беларускага фальклору, народных традыцый, свят, абрадаў: вялікую, магутную, але часам забытую народную культуру мы імкнемся вярнуць ў сферы звычнага яе бытавання — у народны быт, у жыцце. На гэта накіравана і дзейнасць нашых вядомых далёка за межамі рэспублікі фальклорных калектываў "Валачобнікі", "Грамніцы", "Спадчына", "Сябрына", хароў "Мара", "Благавест", ансамбляў дудароў, цымбалістаў, мандаліністаў, акардэаністаў, скрыпачоў і інш.

У структуры вучэбных праграм і планаў значнае месца адводзіцца вывучэнню і даследаванню культуры розных пластоў насельніцтва: гарадской, шляхецкай, элітарнай, а таксама культур іншых краін. Спасціжэнню ўсяго гэтага аб'ему ведаў студэнтамі спрыяюць моцны, высокакваліфікаваны прафесарска-выкладчыцкі склад універсітэта, штогадова запрашаемыя на працу лепшыя дзеячы беларускай культуры, выкладчыкі з іншых краін свету: Германіі, Даніі, Балгарыі, Расіі, Польшчы, Амерыкі, Галандыі.

Паслядоўна і настойліва мы вяртаемся ў структуру еўрапейскай адукацыі і вяртаем Еўропе згубленую самабытную непаўторную беларускую культуру, аднаўляем сваё гістарычнае месца ў еўрапейскай адукацыйнай прасторы, якое наша Беларусь займала доўгія стагоддзі.



За 20 год існавання нашу ўстанову закончылі звыш 13 тысяч чалавек. Яны паспяхова працуюць ў розных установах сацыякультурнай сферы: у клубах, бібліятэках, народных і прафесійных мастацкіх калектывах, аддзелах культуры, школах, сярэдніх прафесійных установах і інш.

Мы знайшлі сваё месца ў гэтай сферы, і таму праблемы працаўладкавання для выпускнікоў нашай ВНУ не існуе. Попыт на спецыялістаў, якіх мы рыхтуем, вялікі: каля 70 % маладых спецыялістаў "разбіраюць" сталічныя і абласныя мастацкія калектывы і ўстановы, астатнія ўладкоўваюцца самі. Асаблівай папулярнасцю ў рэспубліцы карыстаюцца спецыялізацыі "арганізацыя народнай творчасці", "народная інструментальная музыка", "рэжысура народных святаў", "менеджмэнт сацыякультурнай дзейнасці", "харэаграфія" і іншыя. Прадбачачы ў будучым складанасць працаўладкавання бібліятэкараў, якіх рыхтуе факультэт інфармацыйна-бібліятэчных сістэм, мы стварылі новыя спецыялізацыі: бібліятэказнаўства і замежная мова, бібліятэказнаўства і беларуская мова і літаратура, інфарматыка ў сферы культуры, маркетынг бібліятэчнай справы. Гэта дало свой плён, ажывіла набор і стымулявала паступленне на факультэт больш падрыхтаванай моладзі.

Беларускі універсітэт культуры стварае сетку дауніверсітэцкіх устаноў, якія рыхтуюць абітурыентаў. Так, лінгвістычны каледж рыхтуе спецыялістаў па менеджмэнту інфармацыйнай дзейнасці. Сёлета 10 выпускнікоў 13 класа залічаны на 3 курс універсітэта. У Магілеве на базе бібліятэчнага тэхнікума ствараецца філія універсітэта па спецыяльнасці "бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы", у гэтым годзе першыя выпускнікі таксама сталі студэнтамі 3 курса, зроблены першы набор у Мазырскую філію, трэці год рыхтуем арттэрапеўтаў мэтавым прыёмам для чарнобыльскай зоны, музеязнаўцаў для Нясвіжска-Мірскага комплексу і інш.

Наперадзе шмат праблем. Патрэбна мадэрнізацыя матэрыяльна-тэхнічнай базы, абнаўленне парка камп'ютэрнай тэхнікі, набыццё новых музычных інструментаў, стварэнне вучэбных камплектаў "падручнік-дапаможнік-тэкст-запіс" па кожным прадмеце і інш. Праблем мноства, але мы іх вырашым, бо мы будуем наш універсітэт, і будучыня за намі.

# Гісторыя БУК — гісторыя МІК

**1975** *г., — пастанова СМ БССР аб адкрыцці з 1 верасня 1975 года Мінскага інстытута культуры*

**1979** *г. — заснаваны міжведамасны навуковы зборнік "Пытанні бібліяграфазнаўства і бібліятэказнаўства"*

**1981** *г. — пачаў выходзіць навуковы зборнік "Пытанні культуры і мастацтва Беларусі"*

*— адчыняецца спецыялізацыя "методыка выкарыстання сродкаў механізацыі і аўтаматызацыі ў бібліятэчнай справе"*

*— створана кафедра харавых народных спеваў*

**1987** *г. — на факультэце бібліятэказнаўства і бібліяграфіі створаны кафедра фондаў і каталогаў і кафедра галіновых бібліяграфій і дакументазнаўства*

*— створана першая ў ВНУ былога Саюза лабараторыя "Навуковыя асновы рэкрэалогіі"*

**1989** *г. — на базе факультэта культурна-асветніцкай работы створаны два: факультэт самадзейнага музычнага і харэаграфічнага мастацтва; методыкі культурна-асветніцкай работы*

*— адчынена аспірантура*

**1990** *г. — пачалі рыхтаваць спецыялістаў па спецыялізацыі "народныя рамёствы"*

**1991** *г. — створана кафедра педагогікі сацыякультурнай дзейнасці*

**1993** *г. — створана кафедра менеджмэнту сацыякультурнай сферы*

*— у выніку рэарганізацыі пачалі дзейнічаць: факультэт культуралогіі, факультэт мастацкай творчасці і факультэт бібліятэчна-інфармацыйных сістэм*

*— Мінскі інстытут культуры рэарганізаваны ў Беларускі універсітэт культуры*

**1995** *г.*

***студзень*** *— загадам N 8 ВАК пры Кабінеце Міністраў зацверджаны савет па абароне доктарскіх дысертацый*

***люты*** *— створана кафедра этнаграфіі і фальклору*

*— на базе кафедры інфарматыкі і тэхнічных сродкаў ФБІС створаны дзве: агульнауніверсітэцкая кафедра інфармацыйных тэхналогій у культуры і кафедра аўтаматызаваных бібліятэчных і інфармацыйных сістэм*

***сакавік*** *— загадам N 214 ВАК зацверджаны Савет па абароне кандыдацкіх дысертацый*

**СЁННЯ:**

*4 факультэты, 26 кафедраў, на якіх працуюць звыш 300 выкладчыкаў, у т.л. больш 20 прафесараў і 120 кандыдатаў навук, дацэнтаў*

# З павагай і ўдзячнасцю Ваш...

***Мінскі інстытут культуры дасягнуў паўналецця і абсалютна заканамерна перайшоў у новы стан свайго быцця — стаў Беларускім універсітэтам культуры. Усё атрымалася натуральна, як і павінна было стацца. І тут няма чаму здзіўляцца.***

Здзіўляцца можна хіба тым, як няўмольна і імклíва бяжыць час, пакідаючы за сабою не толькі горкія, але і радасныя ўспаміны. Што ні кажыце, а прыемна ўсведамляць, што ты меў некалі дачыненне да справы пачэснай, для людзей і сваёй зямлі карыснай і не такой ужо лёгкай і бязвоблачнай.

Не ў лёгкія часы будаваўся і ствараўся Мінскі інстытут культуры. Не простымі былі яго дваццацігадовае станаўленне і пераход на іншую, вышэйшую універсітэцкую якасць. Але як бы там ні было у часы, што ўжо за плячыма найважнейшай навучальнай установы дзяржавы, сёння галоўнае ў тым, што яна ёсць і працуе на адраджэнне культуры народа і яго гістарычнай памяці, без чаго не бывае ні годнай нацыі, ні сапраўднай Дзяржавы, назву якой можна было б пісаць вялікімі літарамі.

Можна лічыць сябе шчаслівым, калі намаганнямі многіх і многіх самаадданых людзей прадаўжаецца любая табе справа, здзяйсняюцца твае мары. Што да Беларускага ўніверсітэта культуры, то для мяне яны здзейсніліся і здзяйсняюцца, хоць зноў жа і на гэты раз з цяжкасцямі неверагоднымі. Тым, хто іх перамагае, мой нізкі паклон і шанаванне.

Нібы ўчора трымаў у руках урадавую пастанову аб адкрыцці ў Мінску інстытута культуры! Нібы ўчора падпісваў акт аб прыёмцы ў будаўнікоў недабудаванага будынка. Нібы ўчора разам са студэнтамі і выкладчыкамі занёс на восьмы паверх апошняе з дванццаці піяніна.

(Запчасткі да грузавога ліфта "нехта" украў вельмі своечасова.) К гэтаму ж прадапошняму дню перад першым навучальным годам, які пачаўся ў кастрычніку, выявілася, што ў будынку не працуе процiпажарная сістэма, што само па сабе ацэньвалася як сітуацыя надзвычайная. І ці мала якіх іншых праблем, нечаканасцей і недарэчнасцей здараецца ў вялікай справе, калі яна робіцца ўсё ў тым жа пажарным тэмпе...

З цеплынёй і ўдзячнасцю ўспамінаю сёння дзесяткі адказных, добразычлівых, па-чалавечы прыязных людзей, якія мелі дачыненне да стварэння, будаўніцтва і адкрыцця інстытута культуры. Мне сёння здаецца, што менавіта да гэтай навучальнай установы былі тады нейкія асаблівыя адносіны. І вырашальныя з іх былі з боку Ніны Лявонаўны Сняжковай — на той час намесніка старшыні Савета Міністраў, Мікалая Максімавіча Мяшкова — міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, Фёдара Мікалаевіча Капуцкага — яго намесніка па будаўнічых, забеспячэнскіх, кадравых і бог ведае якіх яшчэ справах.



Так шчасліва склалася, што самымі першымі маімі памочнікамі ў арганізацыі вучэбнай, гаспадарчай і фінансавай дзейнасці новастворанай навучальнай установы былі самаадданыя людзі, а сярод іх прарэктары У.У.Зубец і І.К.Бяка, дэканы В.Е.Лявончыкаў і А.І.Смагін, загадчыкі кафедраў Б.І.Бранавіцкі, А.П.Грыцкевіч, А.С.Мікалаеў, В.С.Папоў, Р.А.Ровіна, Н.П.Федзюкова, галоўны бухгалтар М.Г.Іванова, выкладчык І.Ф.Селязнёў, начальнік аддзела кадраў Т.А.Кароткіна і многія іншыя. Хіба ўсіх пералічыш у кароткай юбілейнай нататцы... Усім, хто сёння з намі, пажадаем здароўя, цярпення і моцы ў барацьбе за лепшую долю. А перад тымі, хто за дваццаць год пакінуў нас, схілім галовы і павінімся ў час свята жывых. Іх цагліны ў падмурку годнага збудавання, якім стаў Універсітэт.

Юбілеі будзяць успаміны. А іх безліч і сур'ёзных, і смешных, і нават кур'ёзных. І ўсе пра нешта сведчаць у нашым жыцці.

Сёння нават нейкія непрыемнасці ці не простыя жыццёвыя сітуацыі таго, ужо далёкага цяпер часу ўспамінаюцца як дасціпныя жарты, вядома ж, калі не губляць пачуцця гумару. Ну, чаго варты, напрыклад, такі: прыходзіць да рэктара цэлая вучэбная група і пісьмова просіць звольніць выкладчыка N. Тлумачыць, што ён — кожны дзень п'яны. Сёння мы, маўляў, увесь семінар прасмяяліся...

— ?..

— Ён цэлую гадзіну спрабаваў устаяць на адной назе, каб зашнураваць чаравік на другой, а мы назіралі: упадзе ці не ўпадзе...

Або іншы выпадак, і зноў жа кадравы. Прашу ўжо іншага выкладчыка і па іншай прычыне як-небудзь звольніцца па ўласным жаданні, каб яму ж не рабіць брыдка ды і наогул не ствараць канфлікту. Той глядзіць на мяне блакітнымі, як неба, вачыма і з усмешкай кажа:

— Не, шаноўны Алесь Лявонавіч, вы самі хутчэй звольніцеся, чым ся я...

— ?..

— Днямі вам прапануюць пасаду або міністра культуры, або загадчыка аддзела культуры ЦК...

— ?..

І такі на два тыдні раней за мяне "ўгадаў" мой лёс... І даволі доўга пасля мяне працаваў у інстытуце.

Відаць, сённяшняму рэктару Беларускага універсітэта культуры шаноўнай Ядзвізе Дамінікаўне Грыгаровіч лягчэй працаваць з кадрамі, бо яны, можа, не ўсе такія інфармаваныя па кадравых пытаннях вышэйшага эшалону. А мо ў яе і свае, яшчэ большыя складанасці з прарокамі, што гадаюць, кім хто будзе ў перспектыве.

Пра іншыя, цікавыя эпізоды з майго, на вялікі жаль, не доўгага рэктарства лепш расказаць падчас тоста ў гонар Універсітэта, яго выкладчыкаў і студэнтаў.

Шаноўная Ядзвіга Дамінікаўна, шаноўная прафесура Універсітэта, паважаныя выкладчыкі, лабаранты і студэнты, а вас ужо так многа, прыміце мае самыя сардэчныя віншаванні і найлепшыя пажаданні поспехаў на шырокай ніве нацыянальнай культуры. Няхай наш, цяпер ужо Універсітэт, калі не па назве, то па сутнасці стане і назаўсёды будзе Беларускім Нацыянальным Універсітэтам Культуры.

Кафедру тэатральнай творчасці і яе кіраўніка прафесара Анатоля Вікенцьевіча Сабалеўскага і яго паплечнікаў віншую яшчэ і асобна з адкрыццём універсітэцкага тэатра. Вельмі рады, што гэта мая мара таксама здзейснілася.

**Першы рэктар**
**Алесь ПЕТРАШКЕВІЧ**

---

# Праз цяжкасці—наперад

У перадсвяточныя дні прарэктара па навукова-творчай рабоце універсітэта Аляксандра Кузьміча Лягчылава цяжка застаць на месцы ў рабочым кабінеце. І не дзіўна. Ідуць прагляды канцэртных нумароў, пасяджэнні аргкамітэта, наладжваюцца сустрэчы з кіраўнікамі кафедраў, мастацкіх калектываў.

Тым не менш нам удалася ўгаварыць Аляксандра Кузьміча даць згоду на сустрэчу, у час якой ён адказаў на некалькі пытанняў.

***— Аляксандр Кузьміч, 20 год з дня заснавання навучальнай установы тэрмін значны. Як за гэты час развівалася навука ў нашай установе, якія праблемы сёння стаяць у калектыве ў гэтым накірунку?***

Сёння Беларускаму універсітэту культуры спаўняецца 20 гадоў. Ён быў створаны ў 1975 г. на базе двух факультэтаў: аднаго з самых старэйшых на Беларусі — бібліятэчнага — і культасветніцкай работы. 20 гадоў тэрмін не такі ўжо вялікі для ўстановы. Але за гэты час змены адбыліся значныя.

Рос кантынгент студэнтаў, рос і корпус выкладчыкаў, прафесарска-выкладчыцкага складу. Сёння на 26 кафедрах вядуць вучэбную і навукова-даследчую работу звыш 20 прафесараў, дактароў навук, каля 120 дацэнтаў, кандыдатаў навук. Сярод выкладчыкаў універсітэта шмат вядомых у розных галінах ведаў спецыялістаў, вучоных. Гордасць нашага калектыву — дактары навук, прафесары, што на працягу многіх гадоў карыстаюцца любоўю і павагай усяго калектыву. Гэта В.Е.Лявончыкаў, М.М.Грынчык, А.П.Грыцкевіч, Ю.М.Чурко, Г.І.Барышаў, Г.А.Няцэнка, Б.І.Бранавіцкі.

Побач з імі аўтарытэтныя навукоўцы, таленавітыя выкладчыкі, навуковыя працы якіх служаць асновай школы універсітэцкай падрыхтоўкі спецыялістаў і даследчыкаў у галіне культуры. Сярод іх дацэнты М.З.Яноўскі, Л.А.Дзямешка, У.А.Акуліч, П.Р.Ігнатовіч, А.І.Смагін, С.В.Аўдзей, В.П.Пракапцова, П.А.Гуд, Л.Ф.Голікава і многія-многія іншыя.

Рост навуковага патэнцыялу ВНУ — адзін з фактараў сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства ў цэлым і павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне культуры ў прыватнасці. Ён забяспечваецца ў асноўным за кошт падрыхтоўкі педагагічнага саставу праз дактарантуру, аспірантуру, суіскальніцтва. Працуюць два саветы па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый. Усе тэмы навукова-даследных работ комплексныя. Большая частка з іх выконваецца ў рамках навуковых і навукова-тэхнічных праграм і каардынацыйных планаў рознага ўзроўню (у тым ліку АН РБ). Практычна ўвесь прафесарска-выкладчыцкі састаў удзельнічае ў навукова-даследчай, навукова-метадычнай, творча-выканаўчай рабоце.

З 1979 года універсітэт стаў базавым па выданню штогодняга міжведамаснага навуковага зборніка "Пытанні бібліяграфазнаўства і бібліятэказнаўства", з 1981 года — навуковага зборніка "Пытанні культуры і мастацтва Беларусі". У 1989 годзе наша ВНУ атрымала права выдання вучэбна-метадычнай і навуковай літаратуры.



Дынамічна развіваецца і навукова-даследчая, творчая дзейнасць студэнтаў. У ВНУ функцыянуюць навуковыя гурткі, навукова-праблемныя групы, студэнцкія навукова-даследчыцкія лабараторыі, студэнцкія навукова-творчыя калектывы, аб'яднаныя ў студэнцкую філармонію, студэнцкія атрады культуры, цэнтр навукова-культурнай творчасці моладзі. Састаўной часткай вучэбна-выхаваўчага працэсу сталі паточныя і групавыя канферэнцыі па актуальных праблемах беларускай культуры, перабудовы бібліятэчнай і культурна-асветніцкай работы.

На працягу 1985-1995 гадоў многія студэнты былі прызнаны пераможцамі і прызёрамі рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсаў па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках. Ва універсітэце арганізавана студэнцкае навуковае таварыства. Некаторыя студэнты нашага універсітэта для азнаямлення з бібліятэчна-бібліяграфічнай работай з замежных краінах выязджаюць падчас летніх канікулаў у Польшчу і Балгарыю. Для чытання лекцый універсітэт запрашае замежных выкладчыкаў, вядомых спецыялістаў-культуролагаў ВНУ Польшчы, Германіі, ЗША і іншых краін. Адзінае, што, на мой погляд, перашкаджае нармальнаму развіццю навукі, — гэта фінансавая незабяспечанасць даследаванняў. Прычыны ўсім вядомыя, але, думаецца, калі б мы адчувалі сапраўдны клопат з боку Міністэрства культуры і друку рэспублікі, то маглі б пазбавіцца пэўнай часткі праблем.

***— Вам даводзіцца сумяшчаць не толькі пытанні арганізацыі навуковых даследаванняў, але і творчую работу ва універсітэце. Сённяшнія дні для ўсіх цяжкія з-за эканамічнага становішча краіны. Як гэта сітуацыя адбіваецца на творчым стане мастацкіх калектываў навучальнай установы, тых людзей, якія імі кіруюць?***

Сапраўды, сёння нам усім жывецца вельмі і вельмі няпроста. Адсутнасць сродкаў фінансавання мімаволі адбіваецца на настроі і выкладчыкаў, і студэнтаў, вымушае іх траціць сілы і энергію на пошукі арганізацый, якія маглі б хаця на пэўны час пазычыць сцэнічныя касцюмы, абутак, тэатральны рэквізіт.

За кошт неверагодных намаганняў адміністрацыі нам удалося ў мінулым годзе пашыць касцюмы для двух самых буйных калектываў - духавога аркестра "Светач" і фальклорнага ансамбля "Валачобнікі". А як быць з харавымі, інструментальнымі, харэаграфічнымі, тэатральнымі калектывамі, якіх так багата ў нас?!

Але ж нягледзячы на ўсе гэта універсітэцкая моладзь і выкладчыкі з неверагоднай апантанасцю і натхненнем працуюць, ствараючы новыя канцэртныя праграмы, дэманструючы свае майстэрства на сцэнічных пляцоўках рэспублікі, многія, такія як фальклорны ансамбль "Гуцці", вакальныя ансамблі, добра вядомы ў блізкім і далекім замежжы.

Ну, і скажыце, як без энтузіязму і апантанасці дасягнуць поспеху і шматлікіх лаўрэацкіх званняў, напрыклад тых, што атрымалі студэнты і выкладчыкі кафедры рэжысуры святаў пад кіраўніцтвам дацэнта Пятра Адамавіча Гуда?! Толькі за адзін год гэтай кафедрай рыхтуюцца і праводзяцца дзесяткі рэспубліканскіх і міжнародных святаў, у тым ліку такіх, як Міжнародны фальклорны фестываль, Рэспубліканскае свята гумару, міжнародныя сезонныя святы "Мінскі кірмаш" і г.д.

Усе мы спадзяемся, што прыйдзе той час, калі ўсе без выключэння зразумеюць неабходнасць падтрымкі культуры і мастацтва - галіны, без якой чалавецтву проста не выжыць, якая ратуе нашыя душы і нашыя сэрцы.

І гэта вялікае шчасце, што нашых студэнтаў рыхтуюць такія цудоўныя спецыялісты, верныя сваёй справе і майстэрству, як прафесары А.В.Пякуцька, С.І.Дробыш, Я.М.Рэутовіч, дацэнты П.А.Гуд, У.К.Зяневіч, В.А.Новікаў, выкладчыкі А.М. і Л.В.Яфрэмавы і многія-многія іншыя.

Я упэўнены, што на справаздачных канцэртах, якія штогод ладзіць наш універсітэт, заўсёды будзе аншлаг. Я кажу так, бо добра ведаю: шчырасць, чысціня душы ідуць побач з сапраўдным майстэрствам. Хочаце пераканацца? Прыходзьце 6 кастрычніка ў Тэатр музычнай камедыі. Там мы святкуем свой юбілей — свае 20-годдзе.

***— І яшчэ адно пытанне, Аляксандр Кузьміч, Вы самі - творца, вядомы паэт-песеннік, і, магчыма, больш востра ўспрымаеце рэчаіснасць. Вы разлічваеце на пазітыўныя змены ў культуры ў бліжэйшы час?***

Мы ўсе павінны быць аптымістамі, бо мы беларусы. Нішто і ніколі нас не зламала і не зломіць.Мне думаецца, што хутка ў нас будзе міністэрства, якое культурай будзе займацца па-сапраўднаму. Верыцца, што таленавітая моладзь будзе хутка заўважацца і падтрымлівацца, верыцца, што праца выкладчыка і навукоўца будзе ацэньвацца дастойна, верыцца, што ўсе мы знойдзем грамадзянскую згоду, адкінуўшы ў бок мітынговыя тэорыі фальшывых прапаведнікаў.

**Інтэрв'ю ўзяла Л.ДЗЯМЕШКА**

# Факультэт бібліятэчна - інфармацыйных сістэм

***Са старонак святочнай газеты віншую выкладчыкаў, студэнтаў, усіх супрацоўнікаў універсітэта з юбілеем - 20 годдзем з дня заснавання нашай ВНУ. 20 гадоў для вышэйшай навучальнай установы - сціплая дата. Але ж для выкладчыкаў, якія кожны дзень перадаюць моладзі і веды, і любоў да абранай прафесіі, і вопыт жыцця, - гэта зусім не малы тэрмін.***

Студэнты дваццаці выпускаў раз'ехаліся па рэспубліцы і за яе межы, і большая частка іх працуе ў сферы культуры нашай і іншых дзяржаў.

Яны, бы асілкі, трымаюць на сваіх плячах здабыткі нацыянальнай і сусветнай культуры, нясуць яе святло ў самыя шырокія слаі насельніцтва. Ім значна было б лягчэй выконваць свае пачэсныя абавязкі, каб яны адчувалі з боку дзяржавы больш падтрымкі і зацікаўленасці ў сваей працы. Гэта дапамагло б і дзяржаве хутчэй умацавацца і ўзняць свой аўтарытэт у еўрапейскай і сусветнай супольнасці.

Ужо так павялося, што людзі ацэньваюць зробленае, аглядаюць свой шлях падчас юбілеяў. Вось і мне хочацца расказаць пра тое, як і калі распачалася ў нашай рэспубліцы падрыхтоўка бібліятэкараў — адной са старажытнейшых прафесій ў свеце.

Займаецца падрыхтоўкай спецыялістаў для бібліятэк рэспублікі факультэт бібліятэчна-інфармацыйных сістэм — старэйшы сярод факультэтаў універсітэта, факультэт, на базе якога была заснавана наша навучальная ўстанова.

Факультэт вядзе свой адлік з далекага 1944 года, калі спецыяльнай пастановай СНК БССР пры Мінскім педінстытуце быў створаны бібліятэчны факультэт.

Неабходная для эканамічнага аднаўлення Беларусі і духоўнага развіцця грамадства прафесія хутка набыла значнасць і папулярнасць. На працягу ўсяго тэрміну існавання факультэт паступова набіраў моц: павялічвалася колькасць студэнтаў, ствараліся кафедры, адчыняліся аддзяленні, фарміраваўся штат выкладчыкаў. Змяняліся напрамкі, падыходы да падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі - ад бібліятэкараў для розных тыпаў бібліятэк да спецыялістаў па галіновых комплексах літаратуры і спецыялістаў шырокага профілю, здольных працаваць у навуковых, спецыяльных, дзіцячых і школьных бібліятэках і органах інфармацыі.

У гісторыі факультэта былі розныя часы. Найбольш эфектыўнае развіццё адбывалася ў другой палове 70-х гадоў, калі на базе факультэта быў адчынены Мінскі інстытут культуры. З гэтага часу да сярэдзіны 80-х гадоў спачатку чатыры, а затым пяць спецыяльных кафедраў ажыццяўлялі падрыхтоўку бібліятэкараў па пяці спецыяльнасцях:

- бібліятэказнаўства і бібліяграфія грамадска-палітычнай літаратуры;
- бібліятэказнаўства і бібліяграфія мастацкай літаратуры і літаратуры па мастацтву;
- бібліятэказнаўства і бібліяграфія тэхнічнай літаратуры;



- бібліятэказнаўства і бібліяграфія сельскагаспадарчай літаратуры.

А ў пачатку 80-х гадоў у сувязі з шырокім укараненнем у практыку работы бібліятэк аўтаматызаваных тэхналогій на факультэце была распачата падрыхтоўка кадраў па новай спецыялізацыі - аўтаматызаваныя бібліятэчныя і інфармацыйныя сістэмы.

Зараз, калі вельмі востра адчуваецца неабходнасць унясення змен у прынцыпы, метады бібліятэчнай справы, факультэт шукае шляхі ўдасканалення падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. З гэтай мэтай у мінулым годзе пачалося навучанне па трох новых спецыялізацыях:

- бібліятэказнаўства і замежная мова;
- бібліятэказнаўства і беларуская мова і літаратура;
- маркетынг і менеджмэнт бібліятэчнай справы.

Зараз навучальны працэс ажыццяўляюць тры спецыяльныя кафедры: бібліяграфіі і дакументазнаўства, бібліятэказнаўства, аўтаматызаваных біблятэчных і інфармацыйных сістэм, на якіх працуе 30 выкладчыкаў. Сярод іх дваццаць выпускнікоў факультэта, у т.л. прафесар, доктар педнавук В.Е.Лявончыкаў, загадчыкі кафедраў дацэнты У.А.Акуліч, М.А.Яцэвіч, дацэнты С.В.Зыгмантовіч, Н.У.Клімянкова, В.А.Касап, Н.А.Ляйко і інш.

Выкладчыкі факультэта ўнеслі важкі ўклад у распрацоўку актуальных напрамкаў бібліятэказнаўства, кнігазнаўства, бібліяграфіі і інфарматыкі. Імі падрыхтаваны падручнікі і вучэбныя дапаможнікі па беларускай бібліяграфіі, гісторыі бібліятэчнай справы Беларусі, інфарматыцы і іншых дысцыплінах. Упершыню ў рэспубліцы надрукаваны руска-беларускі тэрміналагічны слоўнік па бібліятэчнай справе.

Выкладчыкі факультэта цесна супрацоўнічаюць з бібліятэкамі рэспублікі, яны — адны з ініцыятараў стварэння Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі, прымалі актыўны ўдзел у распрацоўцы Канцэпцыі развіцця бібліятэчнай справы Рэспублікі Беларусь, Закона аб бібліятэчнай справе. На факультэце ажыццяўляецца поўная работа па стварэнні сістэмы бесперапыннай адукацыі бібліятэкараў у рэспубліцы.

За час існавання факультэт падрыхтаваў каля 10 тысяч спецыялістаў бібліятэчнай справы. Няма такой бібліятэкі ў нашай рэспубліцы, дзе б ні працавалі выпускнікі факультэта. Працуюць яны і ў органах інфармацыі і не толькі Беларусі, але і Расіі, Украіны, Венгрыі, ЗША і іншых краін.

Мы ганарымся нашымі славутымі выпускнікамі. Сярод іх есць пісьменнікі, навукоўцы, супрацоўнікі міністэрстваў, урада рэспублікі. Амаль усе буйнейшыя бібліятэкі рэспублікі (Нацыянальная бібліятэка, Нацыянальная кніжная палата, Рэспубліканская навукова-педагагічная, Прэзідэнцкая, Цэнтральная навуковая бібліятэка АН Беларусі і інш.) узначальваюць былыя выпускнікі факультэта.

Сення факультэт перажывае не самыя лепшыя часы. Новыя складаныя сацыяльна-эканамічныя ўмовы не маглі не адбіцца на дзейнасці факультэта. Значна скарочаны набор студэнтаў на факультэт. З парушэннем адзінай інфармацыйнай прасторы, аснову якой складала дзяржаўная сістэма навукова-тэхнічнай інфармацыі былога Саюза, зменшыўся сусветны паток новых дакументаў, што набывалі бібліятэкі і органы інфармацыі рэспублікі, зменшыліся сродкі не толькі на набыцце новых крыніц інфармацыі, але і на сучасную інфармацыйную тэхніку. Спадзяемся, што гэта часовыя цяжкасці.

Калектыў выкладчыкаў факультэта ўпэўнены, што недалека той час, калі можна будзе весці размову аб сістэме бібліятэчнай адукацыі ў Беларусі, змест якой вызначаецца не толькі ўзроўнем развіцця практыкі, але і нацыянальнымі асаблівасцямі, нацыянальнымі традыцыямі.

Мы падтрымліваем думку амерыканскага калегі, што бібліятэкар - высакародная прафесія, прафесія з высокімі ідэаламі, і калі нам даводзіцца за іх змагацца, будзем рабіць гэта з аптымізмам і пачуццём асабістай значнасці.

**Р.А.РОВІНА, дэкан ФБІС**

# Факультэт мастацкай творчасці

Факультэт мастацкай творчасці быў створаны пасля падзелу факультэта культурна-асветніцкай работы на два факультэты — культуралогіі і мастацкай творчасці.

На факультэце 6 спецыяльных кафедраў:

— духавой музыкі (загадчык дацэнт Новікаў В.А.),

— эстраднага мастацтва (загадчык засл.артыст РБ Раінчык В.П.),

— народна-інструментальнай творчасці (загадчык канд.пед.навук, дацэнт Кузьмініч М.Л.),

— харавога мастацтва (загадчык засл. работнік адукацыі РБ, праф. Пякуцька А.В.),

— беларускай народна-песеннай творчасці (загадчык засл. работнік культуры РБ, праф. Дробыш С.І.),

— харэаграфіі (загадчык дацэнт Лаўрухіна Н.М.).

Кожная з іх рыхтуе спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі па адпаведнай спецыялізацыі:

— арганізатар інструментальна-духавай творчасці: мастацкі кіраўнік аркестра духавых інструментаў, выкладчык спецдысцыплін;

— артыст эстрады (вакальны жанр, інструментальны жанр, камп'ютэрная музыка, размоўны жанр, арыгінальны жанр, танцавальны жанр) і рэжысёр эстрады;

— арганізацыя народна-інструментальнай творчасці: дырыжор аркестра народных інструментаў, выкладчык спецдысцыплін, кіраўнік інструментальнага ансамбля, канцэртмайстар;

— арганізацыя харавой мастацкай творчасці: хармайстр, кіраўнік камернага хору і ансамбля, выкладчык спецдысцыплін;

— арганізацыя беларускай народна-песеннай творчасці: кіраўнік народнага хору (ансамбля), выкладчык спецдысцыплін;

— харэаграфія: кіраўнік харэаграфічнага калектыву, балетмайстар, артыст ансамбля танца, выкладчык студыі бальнага танца.

Адначасова з фундаментальнай агульнапрафесійнай падрыхтоўкай, вывучэннем традыцыйных для вышэйшай школы дысцыплін студэнты пастаянна ўдасканальваюць свае таленты як музыкі, вакалісты, харэографы, працуючы пад кіраўніцтвам вопытных педагогаў.

Займаючыся ў класе інструментальнага, вакальнага ансамбляў, харавым і аркестравым класах, будучыя кіраўнікі мастацкіх калектываў развіваюць навыкі калектыўнага выканання, вывучаюць курсы харавой, аркестравай, эстраднай аранжыроўкі і інструментоўкі.

На кафедрах існуюць аркестравыя, харавыя, танцавальныя калектывы, якія вядомы не толькі ў Мінску, нашай рэспубліцы, але і за яе межамі.

На кафедры духавой музыкі працуюць два аркестры: духавы (кіраўнік былы дырыжор духавога аркестра Міністэрства абароны РБ, старэйшы выкладчык Чоны Я.У.) і эстрадна-сімфанічны (кіраўнік галоўны дырыжор мінскага сімфанічнага аркестра "Калегіум-музыкум" дацэнт Бартноўскі В.В.).

Духавы аркестр універсітэта — пастаянны ўдзельнік усіх свят г.Мінска.

На кафедры народна-інструментальнай творчасці працуюць аркестр рускіх народных інструментаў (кіраўнік ст.выкладчык Анікееў С.А.), цымбальны аркестр (кіраўнік дацэнт Лысянкоў Ф.М.) і фальклорны аркестр "Спадчына" (кіраўнік ст.выкладчык Скарабагатчанка А.В.), які выступае з канцэртамі па радыё, тэлебачанні. Беларускія кампазітары ствараюць для гэтага калектыву арыгінальныя творы. Неабходна адзначыць ансамбль акардэаністаў "Туцці" (кіраўнік ст.выкладчык Сухаварава Л.А.), які з'яўляецца лаўрэатам Усесаюзнага конкурсу. Гэты ансамбль з годнасцю прадстаўляў наш універсітэт у Германіі.

З дня заснавання універсітэта на кафедры харавога мастацтва працуе студэнцкі хор "Мара", якім кіруе загадчык кафедры, засл. работнік адукацыі РБ, праф. Пякуцька А.В. Аснову рэпертуару хору складаюць творы беларускіх кампазітараў, беларускія народныя песні. У рэпертуары хору таксама шмат твораў беларускай класічнай харавой музыкі і замежных аўтараў.

Самабытны і арыгінальны на кафедры мужчынскі хор "Віват" (кіраўнік засл. дзеяч мастацтваў, праф. Рэутовіч Я.М.), высокі узровень якога ацанілі не толькі ў Мінску, але і ў Германіі, і Галандыі.

У 1993 г. на кафедры створаны камерны хор старадаўняй музыкі. У рэпертуары хору духоўная музыка розных эпох і стыляў. Вывучэнне духоўнай музычнай спадчыны — неабходная частка выхавання харавога дзеяча.

На кафедры беларускай народна-песеннай творчасці існуюць пяць творчых калектываў: фальклорны ансамбль "Валачобнікі" (кіраўнік засл. работнік культуры РБ, праф. Дробыш С.І., заг. кафедры), фальклорны ансамбль "Грамніцы" (кіраўнік дацэнт Зяневіч У.К.), ансамбль народнай песні "Талака" (кіраўнік ст. выкладчык Сарока Г.Д.), квартэт народнай песні "Надзея" (кіраўнік ст. выкладчык Баканава Н.Д.), фальклорны ансамбль выкладчыкаў "Сябрына" (кіраўнік праф. Дробыш С.І.).

Гэтыя калектывы кафедры выступаюць з канцэртамі перад працаўнікамі гарадоў і вёсак рэспублікі. Фальклорныя ансамблі "Валачобнікі" і "Грамніцы" прымалі ўдзел у міжнародных фестывалях у Францыі, Іспаніі, Бельгіі, Германіі, Польшчы, ЗША.

Калектыў кафедры харэаграфіі (загадчык дацэнт Лаўрухіна Н.М.) ведаюць не толькі у Беларусі, але і у Расіі, на Украіне, у Прыбалтыцы, Польшчы, Бельгіі, Германіі.

У 1993 г. адкрыты дзве новыя спецыялізацыі: сучасны эстрадны танец (кіраўнікі Л.П. і А.М.Яфрэмавы) і бальны танец (кіраўнікі І.А. і У.У.Парахневічы), якія сябе ўжо добра зарэкамендавалі. На Універсіядзе бальнага танца у 1994 г. нашы студэнты занялі першае месца.

Мы можам ганарыцца выпускнікамі універсітэта, такімі як засл.артыст РБ В.Шчарыца, В.Дайнека, В.Місевіч; нар.артыст РБ У.Траян, Г.Саркіс'ян, Л.Бржэзоўская і інш.

На факультэце працуюць і перадаюць студэнтам свой багаты вопыт прафесары: засл.дзеячы мастацтваў РБ Чурко Ю.М., Рэутовіч Я.М., засл. работнік адукацыі РБ Пякуцька А.В., засл. работнік культуры РБ Дробыш С.І., праф. Мішуроў Г.С., засл. дзеячы культуры Салдатаў М.М., Парамонаў А.М., кандыдаты навук, дацэнты Кузьмініч М.Л., Карацееў А.Л., дацэнты Акапджанян Л.Р., Юрцэвіч Ф.В., Аўсіевіч А.В. і інш.

Вялікую даніну павагі трэба аддаць стваральніку і кіраўніку факультэта кандыдату філасофскіх навук дацэнту Каралькову М.А.

**Намеснік дэкана ФМТ, засл. работнік культуры РБ, дацэнт АЖЫГІН С.І.**

# Знаёмімся: факультэт культуралогіі

Факультэт культуралогіі быў створаны ў 1993 годзе на базе факультэта арганізацыі і методыкі культурна-асветніцкай работы. Апошні ж быў адкрыты ў 1972 г. у Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце.

У той час у нашай рэспубліцы было мала нацыянальных кадраў у сферы культуры, асабліва культасветработнікаў вышэйшай адукацыі, якія маглі б умела і граматна выкарыстаць нацыянальна-культурную спадчыну народа Беларусі, прапанаваць яму новыя формы арганізацыі вольнага часу.

На сёняшні дзень вучэбны працэс на факультэце забяспечваюць восем кафедраў: педагогікі сацыякультурнай дзейнасці, менеджмэнту сацыякультурнай сферы, беларускай і сусветнай мастацкай культуры, тэатральнай творчасці, рэжысуры свят, народных рамёстваў, сацыялогіі і культуразнаўства, этнаграфіі і фальклору.

Працэс адукацыі зарыентаваны на сусветныя адукацыйныя і прафесійня стандарты. Студэнты факультэта (іх зараз звыш 850) рыхтуюцца па наступных спецыялізацыях: менеджмэнт сацыякультурнай сферы, сусветная і айчынная культура, драматургія, кінадраматургія, арганізацыя сацыкультурнай дзейнасці, выхаваўчая работа ва ўстановах сацыякультурнай сферы, акцёрскае мастацтва драматычнага тэатра і кіно, рэжысура дакументальнага фільма, рэжысура масавых відовішчаў і свят, музеязнаўства, тэатральная творчасць, народныя абрады і святы, народныя рамёствы, рэжысура фальклорнага тэатра.

З мэтай высокаякаснай падрыхтоўкі спецыялістаў выкарыстоўвасцца мадэль адукцыі, якая пабудавана на метадалогіі і методыках, што забяспечваюць фарміраванне незалежнага светапогляду і развіццё творчых магчымасцей асобы.

На першым этапе на працягу трох гадоў студэнты вывучаюць блок гуманітарных дысцыплін арыентаваных на нацыянальную культуру навучання, яны забяспечваюць фундаментальную агульнапрафесійную і агульнакультурную падрыхтоўку будучых спецыялістаў. Гэта традыцыйныя дысцыпліны вышэйшай школы: сусветная і нацыянальная гісторыя, літарaратура, філасофія, эстэтыка, этыка, логіка, гісторыя культуры, мастацкая культура Беларусі, беларуская і замежная мовы і інш. У той жа час студэнты атрымліваюць і фундаментальную прафесійную падрыхтоўку ў межах спецыялізацый па наступных прадметах: педагогіка і псіхалогія сацыякультурнай дзейнасці, менеджмэнт, маркетынг, рэклама ў сферы культуры, рэжысура, сцэнічная мова, рытміка, пластыка, этнаграфія і фальклор, малюнак, жывапіс, народныя рамёствы, ахова помнікаў, драматургія і інш.

З трэцяга курса студэнты атрымліваюць спецыялізаваныя веды, уменні і навыкі для дзейнасці ў поўных сферах, галінах, у канкрэтных сацыяльна-культурных установах. Напрыклад, студэнты-рэжысёры масавых відовішчаў і свят, акрамя заняткаў па асноўных прадметах рэжысёрскага цыкла, вывучаюць рэжысуру дзіцячага і народнага свята, беларускую народную музыку і танец, узроставую псіхалогію і арганізацыю зносін.

Многія выпускнікі факультэта — арганізатары тэатральнай творчасці з поспехам працуюць не толькі з самадзейнымі калектывамі, але і на прафесійнай сцэне. Гэтаму спрыяе сур'ёзная акцёрская і рэжысёрская падрыхтоўка студэнтаў. Многія з выпускнікоў-менеджэраў, сацыяльных педагогаў, арганізатараў-метадыстаў працуюць на высокіх кіруючых пасадах: загадчыкаў аддзелаў культуры, дырэктарамі, метадыстамі, інструктарамі Дварцоў і Дамоў культуры, паркаў культуры і адпачынку.

На кафедрах створаны творчыя калектывы — своеасаблівыя вучэбна-практычныя і навукова-даследчыя лабараторыі, дзе студэнты авалодваюць мастацкім майстэрствам. Яны прымаюць удзел у конкурсах, канцэртных праграмах для жыхароў горада і сяла, рыхтуюць святочныя прадстаўленні, выступаюць у праграмах Беларускага радыё і тэлебачання.

Для будучых спецыялістаў вельмі важна ведаць народныя традыцыі, сацыяльна-гістарычныя вытокі свят, сувязь іх традыцыйных формаў з сучаснасцю. Студэнты арганізуюць разнастайныя відовішчы і святы, з'яўляюцца самі іх удзельнікамі. Навучэнцы нашага факультэта з поспехам удзельнічалі ў многіх святах і за мяжой: свяце беларускай песні ў Польшчы , свяце "Славянскі вянок" у Таліне, свяце моладзі у Ераване і інш.

З кожным годам факультэт пашыраецца. На наступны год і ў бліжэйшыя гады плануецца ўвядзенне шэрагу новых спецыяльнасцей і спецыялізацый.

**Дэкан факультэта А.В.ЖУРАЎ**

# Буйнейшы ва універсітэце

**Факультэт завочнага** навучання быў створаны адначасова з інстытутам культуры у кастрычніку 1975 года. Першымі яго студэнтамі сталі студэнты-завочнікі, якія вучыліся на бібліятэчным факультэце Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М.Горкага, і будучыя кіраўнікі тэатральных калектываў, якія вучыліся ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. Усяго на факультэце у той перыяд вучылася звыш 1200 чалавек.

У адпаведнасці з патрабаваннямі жыцця на факультэце пашыралася падрыхтоўка спецыялістаў. Ужо на наступны год ажыццявіўся набор на спецыялізацю "арганізацыя і методыка культурна-асветнай работы". Дарэчы конкурс на гэту спецыялізцыю у той час склаў 9 чалавек на месца, і амаль усе залічаныя ў студэнты мелі дыпломы з адзнакай аб заканчэнні сярэдніх спецыяльных устаноў.

З цягам часу адкрываліся новыя спецыяльнасці і спецыялізацыі. Сёння на факультэце рыхтуюцца спецыялісты па ўсіх спецыяльнасцях і спецыялізацыях, якія існуюць на стацыянары, акрамя літаратурнай работы і музеязнаўства. Затое ёсць спецыялізацыі, як, напрыклад, сацыяльна-псіхалагічная рэабілітацыя асобы мастацтвам, дзе вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў для раёнаў, пацярпеўшых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, якой няма на дзённай форме навучання. У гэтым годзе адкрыт філіял факультэта завочнага навучання пры Мазырскім музычным вучылішчы.

Па колькасці студэнтаў сёння гэта самы буйны факультэт ва універсітэце, дзе вучыцца каля 1400 студэнтаў. Абсалютная іх большасць працуе непасрэдна на абранай ва універсітэце спецыяльнасці.

Усяго за 20 год існавання факультэта яго скончылі звыш 7 тысяч чалавек. Сярод выпускнікоў імёны такіх вядомых спецыялістаў у сферы культуры, як былыя ўдзельнікі ансамбля "Песняры" В.Дайнека, В.Місевіч, А.Эскін, артыст ансамбля "Сябры" М.Сацура, клоун Ф.Гулевіч, канатаходзец А.Сарокін, артысты многіх прафесійных калектываў. Нельга знайсці такія мясціны ў рэспубліцы, дзе б ні працавалі нашы выпускнікі на розных пасадах: арганізатарамі і кіраўнікамі народнай самадзейнай творчасці, метадыстамі культурна-асветнай работы, бібліятэкарамі-бібліёграфамі і інш. Сярод іх — У.Гром, кіраўнік ансамбля "Крупіцкія музыкі", і многія яго ўдзельнікі, загадчык Іўеўскага раённага аддзела культуры У.Журавель, рэжысёр шоу-поп групы "Карусель" В.Гурыновіч, сям'я М. і М.Галадок са Слуцкага раёна і многія другія.

Сумяшчэнне працоўнай дзейнасці і вучобы звязана з вялікімі цяжкасцямі. Тут асабліва важна правільная арганізацыя самастойнай работы. Дапамогу ў гэтым завочнікам аказваюць выкладчыкі, супрацоўнікі бібліятэкі, лабараторый, кабінетаў, якія забяспечваюць іх вучэбнымі праграмамі, рэкамендацыямі, дапаможнікамі, падручнікамі.

У міжсесіённы перыяд праводзяцца дні завочніка, калі можна датэрмінова здаць і экзамены, атрымаць індывідуальныя і калектыўныя кансультацыі. Выкладае тут той жа прафесарска-выкладчыцкі калектыў, што і на дзённай форме навучання.

Студэнты-завочнікі ўдзельнічаюць у навукова-тэарэтычных канферэнцыях, для іх арганізуюцца лекцыі і гурткі на розныя тэмы, сустрэчы з вядомымі дзеячамі культуры і мастацтва.

**А. І. МАРЭЦКІ, дэкан ФЗН**

# У святле кніжных скарбаў

***20 — юнацтва і сталасць, пачатак і рост, пошукі і здабыткі, асэнсаванне і пераасэнсаванне, упэўненасць і прага новага. Менавіта так хочацца сказаць пра 20-гадовы шлях бібліятэкі Беларускага універсітэта культуры. Восенню 1975 года першыя студэнты, тады яшчэ Мінскага інстытута культуры, сталі першымі жаданымі чытачамі бібліятэкі.***

З любоўю і энтузіязмам збіраўся і фарміраваўся кніжны фонд, рупліва складаўся даведачна-інфармацыйны апарат, ствараліся першыя аддзелы. Падмуркі новай бібліятэкі закладвалі адданыя кніжнай справе людзі: Супрун Зінаіда Віктараўна — першая загадчыца бібліятэкі, Лысакоўская Зоя Лявонцьеўна — першы сістэматызатар, Галко Соф'я Іванаўна - першы бібліёграф, Зяневіч Рыма Станіславаўна, Каржанеўская Галіна Мікалаеўна, Захарава Валянціна Іванаўна, Афанасенка Валянціна Гаўрылаўна, Дашкевіч Галіна Сцяпанаўна, Кубліцкая Галіна Аляксандраўна і інш.

Па-братэрску дзяліліся сваімі друкаванымі набыткамі з маладой бібліятэкай у той час Дзяржаўная бібліятэка БССР імя Леніна, бібліятэка Мінскага педагагічнага інстытута, бібліятэка інстытута замежных моў, бібліятэка Мінскага абласнога камітэта КПБ.

Цяпер фонды бібліятэкі налічваюць каля 500 тысяч кніг і друкаваных выданняў на беларускай і замежных мовах. Даволі рэдкія друкаваныя выданні XVIII-XX стагоддзяў на беларускай, рускай, царкоўнаславянскай мовах і на замежных еўрапейскіх мовах, надрукаваныя лацініцай, кірыліцай, грамадзянскім шрыфтам, уяўляюць значную гістарычную і бібліяграфічную каштоўнасць.

Папаўняюцца кніжныя скарбы бібліятэкі не толькі новымі цікавымі выданнямі, але і каштоўнымі ахвяраваннямі з прыватных кнігазбораў вядомых дзеячаў культуры Беларусі Г.І.Барышава, М.М.Грынчыка, І.К. Цішчанкі. Атрымаць неабходныя звесткі пра пэўныя выданні або па разнастайных тэмах можна як з дапамогай грунтоўнага даведачна-інфармацыйнага апарату, так і пабываўшы на інфармацыйна-асветніцкіх мерапрыемствах, якія захапляюча праходзяць у бібліятэцы. Гэта літаратурна-музычныя гасцёўні, сябрыны, сустрэчы з беларускімі паэтамі і пісьменнікамі, дзеячамі навукі і культуры. Штодзённую сваю дзейнасць бібліятэка накіроўвае на пошук і захаванне нацыянальнай гістарычнай і культурнай спадчыны, інфармацыйнае забеспячэнне навучальнага працэсу, дапамогу выкладчыкам універсітэта ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, прапаганду духоўнай культуры, стварэнне бібліятэчнага асяроддзя, якое спрыяе фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці.

Сучасны перыяд падрыхтоўкі спецыялістаў у Беларускім універсітэце культуры (як увогуле ва ўсіх ВНУ) характарызуецца працэсам пераасэнсавання структуры гуманітарных ведаў, выхадам на больш высокі ўзровень спажывання інфармацыйнага патоку адпаведных курсаў. Важная роля ў гэтым працэсе адводзіцца бібліятэцы — інфармацыйнаму цэнтру універсітэта. А поўнасцю аўтаматызаваны бібліятэчна-інфармацыйны цэнтр — гэта ўжо мара не заўтрашняга дня, а рэальнасць і вострая неабходнасць сённяшняга.

Разумеючы актуальнасць праблемы комплекснай камп'ютэрызацыі бібліятэкі, кіраўніцтва універсітэта і бібліятэкі прыкладае вялікія намаганні ў гэтым накірунку.

Распачата распрацоўка канцэпцыі аўтаматызацыі бібліятэкі, ідзе далейшае яе абсталяванне сучаснымі сродкамі аўтаматызацыі, працягваецца стварэнне бібліяграфічных баз дадзеных. Так, дзякуючы магчымасцям ЭВМ супрацоўнікі бібліятэкі падрыхтавалі і выпусцілі першыя бібліяграфічныя паказальнікі: "Мікалай Міхайлавіч Грынчык", "Анатоль Пятровіч Грыцкевіч", "Працы выкладчыкаў факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм (1944-1994 гг.)". Творча і натхнёна ідзе зараз работа над наступным бібліяграфічным паказальнікам, які будзе змяшчаць працы выкладчыкаў Беларускага універсітэта культуры.

За гады свайго існавання бібліятэка была і з'яўляецца не толькі вучэбна-практычнай базай у падрыхтоўцы будучых бібліятэкараў, але і вышэйшай школай практыкі для будучых выкладчыкаў. Узаемаўзбагачальнай была праца ў бібліятэцы Мікалая Яцэвіча, зараз дацэнта кафедры аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм; Рамана Матульскага — дацэнта кафедры бібліятэказнаўства.

За апошнія пяць гадоў з'явіліся першыя парасткі навукова-даследчай працы і сярод супрацоўнікаў бібліятэкі (Л.Доўнар, Т.Самайлюк, Р.Матульскі). Плённа працуе на гэтай ніве Т.Самайлюк, загадчыца аддзела рэдкай кнігі. Яе грунтоўныя артыкулы можна прачытаць на старонках розных навуковых выданняў. Менавіта Т.Самайлюк пачала працу па стварэнні і выданні бібліяграфічных паказальнікаў.

Важным напрамкам дзейнасці бібліятэкі з'яўляецца праца па захаванні нацыянальнай культурнай спадчыны і знаёмству з ёю студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта. Гэту работу супрацоўнікі бібліятэкі вядуць асабліва зацікаўлена і натхнёна.

Бібліятэка мае цвёрды і ўпэўнены поступ, ясна бачыць свае перспектывы, мае вялікае жаданне рэалізаваць свой патэнцыял.

Гісторыя бібліятэкі працягваецца. Наперадзе шмат цікавых, добрых і карысных спраў. І хочацца, каб кожная з іх служыла развіццю і росту навукі і культуры нашай Бацькаўшчыны.

**Л.ДОЎНАР, загадчык аддзела абслугоўвання бібліятэкі**

# Інфармацыйны сказ кафедраў

## ... бібліятэказнаўства

Стварэнне кафедры бібліятэказнаўства звязана з патрабаваннямі грамадства ў бібліятэчных кадрах вышэйшай адукацыі. Кафедра заснавана ў 1944 годзе, з'яўляецца вядучай на факультэце. Заснавальнік яе - вядомы дзеяч бібліятэчнай справы на Беларусі Іосіф Бенцыянавіч Сіманоўскі.

У розны час загадчыкамі кафедры працавалі: Талкачоў М.Ц., Маўрычава К.Г., Калоска Н.М., Якіменка В.Ф. і інш.

З 13 супрацоўнікаў кафедры 12 скончылі наш бібліятэчны факультэт. Прыемна адзначыць, што сярод выкладчыкаў працуе 1 — прафесар, 6 — дацэнтаў.

Кафедра мае цесныя кантакты з вышэйшымі ўстановамі і бібліятэкамі Расіі, Украіны, Галандыі, Германіі, Польшчы, Балгарыі, ЗША, краін Балтыі. Адзін з выкладчыкаў кафедры зараз праходзіць стажыроўку ў бібліятэцы Кангрэса ЗША.

Кафедра ўнесла ўклад у развіццё шматўзроўневай сістэмы адукацыі ва універсітэце: яна з'явілася ініцыятарам стварэння групы па спецыяльнасці "менеджэр інфармацыі бізнесу" пры лінгвагуманітарным каледжы.

Кафедра праводзіць даследаванні ў галіне развіцця бібліятэказнаўства на Беларусі, у прыватнасці па праблемах гісторыі і тэорыі бібліятэчнай справы, фарміравання і выкарыстання бібліятэчных фондаў, распаўсюджання кнігі сярод розных этнічных груп, менеджмэнту і маркетынгу і інш. накірунках.

**Заг. кафедры бібліятэказнаўства, канд.гіст. навук, дацэнт У.А.АКУЛІЧ**

## ... бібліяграфіі і дакументазнаўства

Якасць падрыхтоўкі бібліятэчна-інфармацыйных спецыялістаў залежыць ад арганізацыі і ўзроўню навукова-даследчай работы выкладчыкаў і ўкаранення яе вынікаў у навучальны працэс. Навуковы цэнз выкладчыкаў кафедры за апошнія 20 гадоў значна павысіўся. У яе складзе працуюць адзін прафесар, доктар навук, 10 дацэнтаў, кандыдатаў навук І два старшых выкладчыкі.



Выкладчыкамі кафедры напісаны падручнік "Беларуская бібліяграфія. Агульны курс" (аўтар В.Е.Лявончыкаў), вучэбны дапаможнік "Галіновыя бібліяграфіі Беларусі" (аўтары Л.Р.Амяльковіч, М.В.Іваноў, І.У.Мельнік, Р.А.Ровіна, М.І.Савачкіна, Т.М.Сакалова, В.А.Факееў, Н.М.Цацуліна). Зараз дацэнты М.В.Іваноў, В.А.Касап, Р.А.Ровіна пішуць падручнік па бібліяграфіі прыродазнаўства, тэхнікі і сельскай гаспадаркі; дацэнт С.В.Зыгмантовіч — па арганізацыі і тэхналогіі бібліяграфічнай работы бібліятэк; дацэнт І.У.Мельнік — па эканамічнай бібліяграфіі; дацэнт В.І.Саітава — па гісторыі сусветнай бібліяграфіі.

Ператварэнне інстытута культуры ва універсітэт патрабуе ад выкладчыкаў не толькі ўдасканалення сістэмы адукацыі, а прынцыповай змены яе зместу і арганізацыйна-метадычных падыходаў. Таму па ўсіх дакументазнаўчых і бібліяграфічных дысцыплінах былі распрацаваны новыя праграмы з улікам апошніх навуковых дасягненняў, айчыннага і замежнага вопыту, шматузроўневага навучання. Каб выйсці на еўрапейскі і сусветны ўзровень падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў, выкладчыкі пачалі вывучаць лепшыя замежныя мадэлі універсітэцкай адукацыі. В.Е.Лявончыкаў і Р.А.Ровіна выступілі з дакладамі на секцыі адукацыі і навучання Міжнароднай федэрацыі бібліятэчных асацыяцый і ўстаноў (г.Масква); В.Е.Лявончыкаў удзельнічаў у Міжнароднай навуковай канферэнцыі па эфектыўных методыках і тэхналогіях навучання ў вышэйшай школе (г.Шчэцін,Польшча). Дацэнты М.В.Іваноў і Э.С.Суддзя з групай студэнтаў выязджалі на вытворчую практыку ў Балгарыю і Польшчу. Дацэнт Р.А.Ровіна вывучала вопыт і чытала лекцыі Ў Вяліка-Тырнаўскім універсітэце.

На кафедры 5 аспірантаў і 2 суіскальнікі працуюць над кандыдацкімі дысертацыямі.

**В.Е.ЛЯВОНЧЫКАЎ, доктар пед. навук, прафесар**

## ... аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм

Кафедра (АБІС) сустракае 20-годдзе універсітэта зусім маладою. Яна ўтворана ў лютым 1995 г. Але на кафедры працуюць выкладчыкі, якія знаходзіліся ў вытокаў Мінскага інстытута культуры. З першых дзен адкрыцця універсітэта працуе Л.Р.Амяльковіч, дацэнты Н.В.Хахлова і А.І.Усціменка працуюць з 1976 года. Шмат гадоў працуюць у нашай навучальнай установе дацэнты кафедры Б.В.Пятрэнка І У.А.Кірэеў, кандыдат філалагічных навук С.У.Ільына і прафесар, доктар навук, член-карэспандэнт АН Беларусі В.А.Чарнышоў.

6 кастрычніка 1975 года лёсам было даравана ўпершыню адчыніць дзверы інстытута і мне, тады яшчэ дваццацігадоваму юнаку, студэнту 2 курса бібліятэчнага факультэта, а цяпер - загадчыку вышэйназванай кафедры.

Кафедра АБІС забяспечвае выкладанне дысцыплін інфармацыйнага цыкла, звязаных з аўтаматызацыяй бібліятэчна-інфармацыйных працэсаў, курыруе адпаведную спецыялізацыю, якая карыстаецца папулярнасцю ў студэнтаў. Выпускнікі спецыялізацыі ўзначальваюць аддзелы аўтаматызацыі буйнейшых бібліятэк Беларусі, з'яўляюцца тэхнолагамі аўтаматызаваных бібліятэчных сістэм; працуюць у службах навукова-тэхнічнай інфармацыі, кнігавыдавецкіх і кнігагандлёвых установах, камерцыйных інфармацыйных фірмах.

Кафедра мае пэўныя здабыткі ў галіне падрыхтоўкі падручнікаў, праграм і вучэбна-метадычнай дакументацыі, мае шэраг цікавых навуковых прац. Але яшчэ шмат трэба зрабіць, асабліва ў накірунку ўдасканалення зместу адукацыі, падрыхтоўкі новых вучэбных праграм. Кафедра павінна ўзначаліць працу па пераарыентацыі ўсей вышэйшай бібліятэчна-інфармацыйнай адукацыі ў адпаведнасці з апошнімі дасягненнямі ў галіне аўтаматызацыі бібліятэчнай справы.

Прыйшоў час адкрыцця новай спецыяльнасці "навукова-інфармацыйная дзейнасць", у рамках якой жыцце патрабуе падрыхтоўкі менеджэраў інфармацыйных службаў рознага профілю. Кафедрай ужо распрацаваны адпаведны вучэбны план і робяцца захады па адкрыцці гэтай спецыяльнасці.

Вялікага клопату патрабуе абсталяванне камп'ютэрнага класа на факультэце БІС, а таксама стварэнне аўтаматызаванай бібліятэчнай сістэмы і сеткі ў бібліятэцы універсітэта, якая павінна стаць своеасаблівым палігонам пры падрыхтоўцы кадраў у галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

У гэтыя святочныя дні хочацца пажадаць усім супрацоўнікам і студэнтам універсітэта здароўя, плёну, радасці ад сваей працы. Няхай Бог і Радзіма не пакінуць наш Беларускі універсітэт культуры ў сваёй міласці.

**Заг.кафедры аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм М.ЯЦЭВІЧ**

# Нестар беларускага тэатра

Імя Барышава Гурыя Іларыёнавіча звязана з гістарычнай тэатразнаўчай і мастацтвазнаўчай навукай Беларусі. Асноўнай тэмай яго даследаванняў стаў беларускі прафесійны і народны тэатр. Паслядоўна і карпатліва, збіраючы невядомыя раней факталагічны матэрыял, ён стварыў найбольш поўную карціну фарміравання і функцыяніравання драматычнага тэатра на Беларусі. На гэтай падставе распрацаваў канцэпцыю поліэтнічнай і полілінгвістычнай шматслойнай тэатральнай культуры Беларусі ХУШ ст.

Даследаванні Барышава Г.І. апублікаваны ў шматлікіх выданнях: "Гісторыя беларускага тэатра"(1983г.), "Музычны тэатр Беларусі. Дакастрычніцкі перыяд" (1990г.),"Беларускі народны тэатр батлейка"(1962г., тут ён выступіў як сааўтар). Шырока вядома яго манаграфія "Тэатральная культура Беларусі ХУШ ст."(1992г.).

Доктар мастацтвазнаўства, прафесар Г.І.Барышаў перадае свой вопыт студэнтам Беларускага універсітэта культуры. Глыбокія веды, высокае лектарскае майстэрства, артыстызм у падачы навукова-метадычнага матэрыялу здабылі яму вялікую павагу і любоў сярод студэнтаў і калег-выкладчыкаў.

**З павагай
супрацоўнікі кафедры**

# Роздум з нагоды...

Юбілей Беларускага універсітэта культуры не стогадовы, а таму можна толькі радавацца, што ўсё яшчэ наперадзе. Цяпер жа на юнацкім этапе свайго развіцця варта падумаць аб той выключна адказнай і ганаровай місіі, што наканавана яму самым гістарычным лёсам.

Па-першае, БУК — вучэбная ўстанова унікальнага культурна-асветніцкага профілю, своеасаблівы носьбіт і рассаднік лепшых традыцый нацыянальнай мастацкай культуры, сапраўдная кузня маладых кадраў на вельмі важным, можна сказаць, пераломным этапе адраджэння культурнай спадчыны беларусаў. Адкрыццё нашага універсітэта супадае з працэсам імклівага фармавання новай грамадскай свядомасці, з працэсам абнаўлення нацыянальнага менталітэту пасля шматвяковай "летаргіі нацыянальнага жыцця" (М.Багдановіч).

У гэтых умовах першачарговай задачай нашага універсітэта становіцца ўсебаковая падрыхтоўка непасрэдных арганізатараў і кіраўнікоў творча-выканаўчых аматарскіх калектываў, але і выхаванне сапраўдных дзеячаў нацыянальнай духоўнай культуры, якія арганічна спалучаюць у сабе талент выканаўцы і даследчыка, нястомнага прапагандыста і збіральніка народных скарбаў, здольных сінтэзіраваць іх з лепшымі здабыткамі сусветнай культуры. Выдатным узорам такой маштабнай творчай інтэграцыі нацыянальных здабыткаў з сусветнымі з'яўляецца дзейнасць Антона Грыневіча, Рыгора Шырмы, Генадзя Цітовіча, Антона Валынчыка, Уладзіміра Мулявіна, Юліі Чурко, Васіля Раінчыка і многіх іншых прадстаўнікоў сучаснай беларускай культуры. Выдатны ўзор для пераймання нашым студэнтам і выкладчыкам.

**М.М.ГРЫНЧЫК, прафесар.**

## Самыя добрыя, чулыя і паважаныя людзі універсітэта



Былы прарэктар па вучэбнай рабоце КЛЯЦКОЎ А. Г. →



← Майстар па рэстаўрацыі народных інструментаў ПУЗЫНЯ У. Я.

## Распавядаюць выпускнікі ФБІС

# Юбілей — свята і для Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

***На календары культурнага жыцця краіны пачатак восені ў гэтым годзе азнаменаваны вялікай колькасцю юбілейных дат. Сярод іх — дваццацігадовы юбілей Беларускага універсітэта культуры.***

Больш за паўстагоддзе таму на Беларусі, у сценах Мінскага педагагічнага інстытута, быў створаны бібліятэчны факультэт. Вялікія змены адбыліся з ім за гады існавання. І,мабыць, галоўнай з іх стала стварэнне на яго аснове самастойнай навучальнай установы — інстытута, а зараз Беларускага універсітэта культуры. Вось чаму яго юбілей — свята для ўсіх бібліятэк рэспублікі. Нацыянальная бібліятэка Беларусі разам з усімі падзяляе святочны настрой. З факультэтам бібліятэчна-інфармацыйных сістэм універсітэта Нацыянальную бібліятэку звязваюць даўнія трывалыя традыцыі супрацоўніцтва.

З'яўляючыся адзінай навучальнай установай, якая рыхтуе бібліятэчных спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй для Рэспублікі Беларусь, факультэт — сапраўдная "кузня кадраў" для бібліятэк розных сістэм і ведамстваў, зразумела, і для Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Дастаткова сказаць, што ў розныя перыяды выпускнікі бібліятэчнага факультэта складалі ад 57% да 64% бібліятэчных работнікаў Нацыянальнай бібліятэкі,у тым ліку ўвесь склад дырэкцыі.Большасць загадчыкаў аддзелаў — таксама выпускнікі гэтага факультэта. На завочным аддзяленні пастаянна займаюцца маладыя супрацоўнікі бібліятэкі (зараз гэта 17 чалавек). Творчыя, перспектыўныя спецыялісты бібліятэкі ўдасканальваюць і пашыраюць свае веды ў аспірантуры універсітэта.

У сваю чаргу бібліятэка "пастаўляе" факультэту выкладчыкаў, якія да абароны дысертацый працавалі ў Нацыянальнай бібліятэцы (прафесар Дзямешка Л.А., дацэнт Матульскі Р.С.). Бібліятэка з"яўляецца і базай для павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў факультэта. Штогод некалькі чалавек прымаюцца для праходжання стажыроўкі, у працэсе якой яны знаёмяцца з апошнімі напрацоўкамі ў галіне бібліятэчнай справы. Прыкладам вельмі плённага супрацоўніцтва, якое склалася паміж выкладчыкамі факультэта і спецыялістамі аддзела апрацоўкі ў апошнія гады, стала работа над вучэбным дапаможнікам "Составление библиографического описания документов и организация каталога".

У розныя перыяды загадчыкі аддзелаў, члены дырэкцыі бібліятэкі чыталі студэнтам курсы лекцый, вялі непасрэдна на факультэце практычныя заняткі. Традыцыйна склалася так, што кожны год дзяржаўныя экзаменацыйныя камісіі бібліятэчнага факультэта ўзначальваюць дырэктар бібліятэкі і яго намеснікі.

Вельмі важным у справе падрыхтоўкі спецыялістаў Нацыянальная бібліятэка лічыць арганізацыю і правядзенне вытворчай практыкі студэнтаў факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм з 2-га і да апошняга курса.

Цікавым напрамкам супрацоўніцтва ў апошнія гады з"яўляецца правядзенне сумесных даследаванняў. Вельмі значным стала міжведамаснае даследаванне "Чытач навуковай бібліятэкі г. Мінска", якое праводзілася ў 1993-1995 гг.

Найбольш мэтазгодным бачыцца спалучэнне навукі і практыкі пры правядзенні навукова-практычных канферэнцый, шырокі ўдзел у якіх прымаюць вядучыя спецыялісты буйнейшых бібліятэк Беларусі і навукоўцы Беларускага універсітэта культуры. Тэмамі такіх канферэнцый у апошнія гады былі:"Беларуская бібліяграфія як частка нацыянальнай культуры","Бібліятэка і грамадства","Бібліятэка і нацыянальная праграма "Спадчына","Бібліятэчныя кадры:сучасны стан,праблемы,перспектывы","Чытач навуковай бібліятэкі і шляхі ўдасканалення яго абслугоўвання", "Бібліятэчны менеджмэнт".

Ёсць усе падставы меркаваць, што існуючыя сувязі паміж Беларускім універсітэтам культуры і Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі будуць падтрымлівацца і пашырацца ў далейшым. Набывае сталасць факультэт бібліятэчна-інфармацыйных сістэм, расце майстэрства яго выпускнікоў, якія ўпэўнена спалучаюць традыцыйныя метады работы ў бібліятэцы з сучаснымі аўтаматызаванымі тэхналогіямі. Так і павінна быць. ХХ1 век чакае спецыялістаў з сапраўды універсітэцкімі ведамі.

**Дырэктар
Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі
Г.М. АЛЕЙНІК,
выпускніца
ф-та 1963 г.**

# Удалы выбар

Аглядаючыся на мінулыя дваццаць гадоў з дня заканчэння бібліятэчнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута імя М.Горкага, думаю аб тым, што выцягнуў шчаслівы латарэйны білет, бо выбраў прафесію па душы і складу свайго характару. Інстытут даў добрую тэарэтычную базу, навучыў прымяняць веды на практыцы, дапамог зразумець, што галоўнае ў жыцці не адзнакі, а твой унутраны свет, твае адносіны да людзей і твае месца ў гэтым складаным свеце. З цеплынёй і ўдзячнасцю ўспамінаю выкладчыкаў факультэта, якія далі мне і маім сябрам пуцёўку ў працоўнае жыццё: Гэта Лявончыкаў В.Б, Пакала М.І., Ровіна Р.А., Ролева Р.А., Сакалова Т.М. і іншыя, яны навучылі асновам будучай прафесіі, выхавалі любоў да яе, дапамаглі зразумець неабходнасць пастаяннай самаадукацыі. Інстытут дае толькі першапачатковы штуршок тваей дзейнасці. У час працы пастаянна ідзе перааацэнка жыццёвых каштоўнасцей, сваіх ведаў і сваіх магчымасцей. Мая праца не самая прэстыжная і аплачваемая, але гэта кампенсуецца ўдзячнасцю чытачоў, новымі сустрэчамі, зносінамі з разумнымі і добрымі людзьмі. Мая праца дае яшчэ адну вялікую радасць — мець заўсёды лепшага сябру і настаўніка — кнігу.

Я працаваў у двух буйнейшых бібліятэках рэспублікі. Спачатку ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы АН Беларусі, а затым у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Менавіта тут прыйшло вялікае жаданне спасцігнуць усю складанасць бібліятэчнай працы і зразумець, што мая прафесія вельмі патрэбна людзям. Гэта дае магчымасць у наш нестабільны час захаваць аптымізм у жыцці, не расчаравацца у сваей прафесіі з-за яе нізкай аплачваемасці, неразумення вышэйшых дзяржаўных структур, што бібліятэка — гэта месца, дзе чалавек спасцігае ўсю мудрасць папярэдніх пакаленняў, узбагачае свае веды, чым садзейнічае духоўнаму росту сваей асобы. Добрым памочнікам людзям у гэтым працэсе з"яўляецца бібліятэкар.

Зараз, працуючы на адказнай пасадзе ў Міністэрстве культуры і друку, бачу свой абавязак у тым, каб дапамагчы бібліятэкам і людзям, якія там працуюць, у складаны пераходны перыяд заняць свае належнае месца ў жыцці маладой дзяржавы. Веру, што гэта дзяржава будзе з разуменнем ставіцца да бібліятэк і аказваць ім адпаведную падтрымку.

**Гал. спецыяліст па бібліятэках
Міністэрства культуры і друку
Беларусі. ШЫШКІН У. А.,
выпускнік ф-та 1975 г.**

# І радасць, і шкадаванне

Калі на сустрэчы з чытачамі мяне просяць расказаць сваю біяграфію, я абсалютна праўдзіва адказваю: "Самыя шчаслівыя гады былі падчас студэнцтва ў Мінскім інстытуце культуры".

Як гэта было здорава: пасля армейскай муштры, хамства, боек, прымітывізму (у вучэбцы ў нас было некалькі хлопцаў, беларусаў між іншым, якія не умелі чытаць і пісаць) патрапіць раптам "з карабля на баль", апынуцца ў светлай аўдыторыі, сярод падручнікаў, канспектаў, маладых тварыкаў, разумных, ветлівых выкладчыкаў, якія ніколі не крычаць: "Рядовой Федоренко, встать, смирно!..."

То былі гады майго першага сапраўднага кахання, першых літаратурных спробаў, і варта адзначыць і падзякаваць лішні раз тым жа выкладчыкам: з якой цярплівасцю, тактоўнасцю ставіліся яны заўседы да мяне, студэнта, што па вялікім рахунку быў "не падарунак". Памятаю, як на трэцім курсе я захварэў, прапусціў зімовую сэсію, але мне дазволілі пераздаваць і нават не знялі стыпендыю.

Пытаюць таксама: ці памагла вучоба на бібфаку літаратурнай творчасці? Дзіўнае пытанне. Бібліятэчна-бібліяграфічная падрыхтоўка, на маю думку, той важнейшы падмурак, без якога немагчыма ўвогуле ніякая інтэлектуальная дзейнасць, тым больш у мастацкай сферы. І кожнаму адукаванаму чалавеку ў першую чаргу абавязкова трэба набыць хоць бы прасцейшыя навыкі, так сказаць, "лоцмана", каб быць здольным арыентавацца ў кніжным "акіяне". Мне ў гэтым сэнсе, лічу, проста пашэнціла. У бібліятэках, збіраючы матэрыялы да таго ці іншага твора, я з патаемным гонарам пераконваюся, што чатыры гады навучання не прайшлі дарма.

... І вось, калі заходжу ў цяпер ужо Універсітэт культуры, іду любімымі калідорамі, вітаюся і размаўляю са знаёмымі выкладчыкамі, узіраюся ў маладыя, вясёлыя твары студэнтаў, мне і самому робіцца неяк радасна, і аднačасова сумна, і адначасова шкада чагосьці... Нібы пераглядаю дарагія фотаздымкі ў альбоме...

**Андрэй Федарэнка, выпускнік бібліятэчнага факультэта 1990 г., пісьменнік, лаўрэат літаратурнай прэміі І.Мележа**

# Факультэт мастацкай творчасці

## Гісторыя кафедры духавой музыкі

Гісторыя кафедры духавой музыкі пачынаецца з першага дня існавання інстытута культуры. Дзякуючы намаганням выдатнага музыканта, заслужанага дзеяча культуры А.С.Нікалаева ўжо сярод першых абітурыентаў інстытута былі і выканаўцы на духавых інструментах. Менавіта А.С.Нікалаеў прадбачыў будучыню інстытута і дбаў пра яго развіццё як буйнай навучальнай установы.

Праз год на кафедры, якой кіраваў А.С.Нікалаеў было адкрыта духавое аддзяленне, запрошаны на працу прафесійныя музыканты, праведзены набор студэнтаў. І, як вынік, пачаў дзейнічаць першы духавы аркестр. З гэтага часу ўсе ўрачыстасці як у інстытуце культуры, так і ў Кастрычніцкім р-не г.Мінска не абыходзіліся без удзелу духавога аркестра. Яшчэ праз год на кафедры з'явіўся новы творчы калектыў. Гэта эстрадны аркестр, які прымаў удзел у фестывалях і конкурсах як у маштабах рэспублікі, так і ў масштабах былога Саюза.



Але ж, як гэта часцей за ўсе бывае, шлях кафедры не быў роўным. Пачаліся дзяленні і ўсялякія змены.

І вось наступіў 1988 год. Кафедру духавой музыкі ўзначаліў малады, руплівы музыкант-духавік Віктар Аляксандравіч Новікаў.

Цяпер кафедра духавой музыкі мае канцэртны духавы аркестр "Светач", эстрадна-сімфанічны аркестр. На кафедры працуюць выдатныя музыканты. Створана шмат інструментальных ансамбляў. Сярод іх найбольш вядомыя квартэт кларнетыстаў, квартэт флейтыстаў "Мроя", квартэт трамбаністаў, браз-квінтэт. Студэнты кафедры прымаюць удзел амаль ва ўсіх творчых калектывах іншых кафедраў Універсітэта. Выпускнікі працуюць не толькі кіраўнікамі духавых і эстрадных аркестраў, але і артыстамі прафесійных аркестравых калектываў.

На кафедры вядзецца вялікая навукова-метадычная і навукова-творчая работа.

Штогод праводзяцца канцэрты класаў і справаздачныя канцэрты. Нават у дзяржаўныя іспыты кафедра праводзіць на буйных канцэртных пляцоўках як канцэрты для шырокіх мас грамадскасці.

З юбілеем Вас, сябры, калегі!!!

**Ф.Юрцэвіч, дацэнт кафедры духавой музыкі.**

## Кафедра тэорыі музыкі

Музычна-тэарэтычныя дысцыпліны, такія як сальфеджыо, тэорыя музыкі, гармонія, поліфанія, аналіз музычных твораў, на працягу ўсей гісторыі развіцця музычнай педагогікі з'яўляліся асновай прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў. Таму адначасова з адкрыццём факультэта культурна-асветніцкай работы была ў 1975 г. створана кафедра тэорыі музыкі і фартэпіяна. Першым загадчыкам кафедры быў вядомы ў Беларусі музычны тэарэтык Кудрашоў А.В. У 1983 г. яго змяніў кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт Смагін А.І. З гэтага года кафедра была пераўтворана ў кафедру тэорыі музыкі. Тут працуе 10 чалавек. Гэта кваліфікаваныя выкладчыкі. Сярод іх кандыдаты мастацтвазнаўства Каленька Р.Р., вядомы даследчык і знаўца беларускай музыкі; выдатны спецыяліст у галіне музыкі Ухава І.У.; Хадзінская Н.М., таленавіты музыкант, зусім нядаўна яна абараніла дысертацыю па актуальных і вельмі складаных пытаннях гармоніі у Маскоўскім музычна-педагагічным інстытуце ім. Гнесіных.

Амаль усе выкладчыкі працуюць з першых дзен адкрыцця інстытута. Гэта і беларускі кампазітар Зайцаў А.П., таленавіты папулярызатар музыкі Івчанка Н.М., выдатныя спецыялісты па выкладанні сальфеджыо Шутовіч Н.В., Чучалова С.І. і фальклора Галіцкая Н.П.

Усю гаспадарку кафедры трымае ў сваіх руках на працягу ўсяго часу існавання кафедры былая выпускніца інстытута Кароткая В.П.

Дружалюбная, творчая атмасфера ўзаемаадносін дазволіла кафедры дасягнуць значных поспехаў у навуковай і метадычнай рабоце, знайсці свае падыходы ў выкладанні музычна-тэарэтычных дысцыплін з улікам асаблівасцей музычных спецыялізацый факультэта і заняць дастойнае месца сярод аналагічных кафедраў навучальных устаноў Беларусі.

**А. І. СМАГІН, загадчык кафедры.**

## З урачыстым юбілеем!

Кожны юбілей — заўсёды свята, хоць у ім разам ёсць і нейкая журбота. Радасць — вядома чаму. Таму, што здзейсніліся пэўныя надзеі, планы, жаданні. А журба таму, што гэтыя цікавыя надзеі нельга паўтарыць зноў, іх можна перажыць толькі ва ўспамінах, пазнаёміцца з імі, звярнуўшыся да матэрыялаў музея універсітэта, архівам кафедры.

Ніхто не можа адмаўляць сёння, што ў нас склаліся багатыя традыцыі добразычлівых адносін паміж выкладчыкамі і студэнтамі. На наш погляд, менавіта такая добразычлівая атмасфера, здаровы сацыяльна-псіхалагічны клімат садзейнічае творчаму росту прафесарска-выкладчыцкага складу, росту свядомых адносін студэнтаў да сваіх абавязкаў. Нельга сказаць, што гэты працэс развіваўся і развіваецца роўна, тут ёсць поспехі і памылкі, творчыя знаходкі і пэўныя страты. На змену адным выклдчыкам прыходзілі другія. Але ўсе яны карысталіся аўтарытэтам сярод калег сваёй спецыялізацыі, умелі запаліць студэнтаў сваёй прафесійнай эрудыцыяй, праяўлялі такт і вялікае цярпенне, дапамагалі студэнтам паверыць ў сябе, у свае сілы ў нялёгкай справе набыцця неабходных ведаў.

Можна ганарыцца, што выпускнікі нашай кафедры паспяхова ўзначальваюць лепшыя аматарскія эстрадныя, духавыя аркестры, выкладаюць у ДМШ, музычных вучылішчах і вучылішчах культуры і мастацтваў, працуюць артыстамі ў такіх вядучых аркестравых калектывах, як Мінскі аркестр духавых інструментаў "Няміга", канцэртна-эстрадны аркестр пад кіраўніцтвам М.Фінберга, аркестр Міністэрства абароны, аркестр Міністэрства унутраных спраў, ансамбль песні і пляскі МАРБ, аркестр Мінскага дзяржаўнага цырка, аркестр тэле-рыдыё кампаніі РБ, нясуць службу ваенных музыкантаў у розных аркестрах рэспублікі.

У дні славутага юбілея нам, былым выпускнікам, хацелася б пажадаць цяперашнім студэнтам універсітэта культуры вялікай працавітасці, творчай актыўнасці, поспехаў. Мы хочам, каб студэнты ведалі, што аддаюць кожнаму з іх частку сваёй душы, шчыра дзеляцца сваімі высокапрафесійнымі ведамі на набыццё якіх пайшло многа год. У сваю чаргу мы удзячны тым выкладчыкам, якія нас вучылі, нізкі вам паклон і словы шчырай падзякі за ўсё, што Вы нам перадалі. Гэту эстафету пакаленняў і ведаў мы пастараемся перадаць нашым студэнтам.

Віншуем усіх студэнтаў і нашых калег з юбілеем. Жадаем аптымізму, творчага і навуковага росту, сямейнага дабрабыту.

З ЮБІЛЕЕМ, НАШ УНІВЕРСІТЭТ !

**Аляксандр КАРАЦЕЕЎ, дацэнт,**

**Ігар МАНГУШАЎ, ст.выкладчык,**

**Аляксандр КАРАТКЕВІЧ, выкладчык кафедры духавой музыкі.**

## Іх сустрэча 20 год таму мела вялікі сэнс

Маладыя, таленавітыя, яны зразумелі адзін аднаго ў імкненні стварыць сваю нацыянальнаю школу музычнай культуры. А што можа быць цудоўней, што больш за ўсё здольна прымірыць нашыя сэрцы, як не высокая гармонія музыкі і яе адчуванне ?!

Яны, выкладчыкі кафедры аркестравага дырыжыравання, рабілі разам першыя крокі ў пошуку сэнсу свайго мастацтва, разам спасцігалі сутнасць свайго прызначэння.

А гады ішлі. І былі першыя поспехі. І рабілася добра І ўтульна, калі ва ўрачыстых абставінах канцэртнай залы гучала музыка ў выкананні студэнтаў кафедры.

Наогул сення ўжо можна гаварыць аб творчай самабытнасці гэтага калектыву. Поспех першых канцэртных праграм заўседы спалучаўся з адкрыццём і ўдасканаленнем умоў, спрыяючых поспеху прафесійнага навучання.

З вялікай удзячнасць схілім галовы прад памяццю аб першым кіраўніку кафедры з.д. культуры Украіны А.С.Нікалаеве. Гэты таленавіты і сумленны чалавек заклаў тыя творчыя традыцыі, якія і ў наш час падтрымліваюцца і развіваюцца.

Хто ні помніць выступленні аркестра народных інструментаў пад кіраўніцтвам Нікалаева ? Вытанчаным ладам сваёй інструментальнай тэхнікі ён узбагачваў сугучча народных інструментаў. Сення яго аркестр гучыць і стварае добрую славу нашай рэспубліцы.

Шмат аркестравых і ансамблевых калектываў з'явілася на кафедры. І назва стала ў кафедры іншая, але настальгія аб першых кроках не пакідае ветэранаў.

А былыя вучні ўсе больш сцвярджаюць сваю прыхільнасць да традыцыі. Сення кафедру ўзначальвае былы выпускнік, малады вучоны М.Л.Кузьмініч. Галоўная яго мэта — вызначыць сутнасць музычнай адукацыі, механізм мастацкага эфекту музыкі ў працэсе пазнання і аб'яднаць увесь калектыў кафедры ў гэтым пошуку.

Сення ва універсітэце вучацца ... Урэшце, навошта аб гэтым расказваць, ты бачыш Іх сам. Ажыўлена гутараць яны ля ўваходу, сядзяць з кнігамі на лаўках у двары універсітэта, шумнымі, вясёлымі групамі ідуць нам насустрач ...

А пачыналася ўсе толькі 20 год таму.

**ЦАРОВА А.А.**

Кафедра беларускай народна-песеннай творчасці ажыццяўляе падрыхтоўку студэнтаў па спецыяльнасцях "кіраўнік народнага хору, выкладчык спецдысцыплін", "артыст фальклорнага гурту, выкладчык фальклору".

Падрыхтоўка спецыялістаў прадугледжвае паглыбленае вывучэнне музычнай спадчыны нашага народа і уключае такія дысцыпліны, як беларуская народная творчасць, аранжыроўка, расшыфроўка народных песень з улікам новых напрамкаў ў гэтай галіне на аснове камп'ютэрнай тэхналогіі.

За гады існавання кафедра беларускай народна-песеннай творчасці выпусціла больш за 250 чалавек, многія з іх працуюць кіраўнікамі фальклорных калектываў, атрымалі званне "народны". Балгарыя, Румынія, Польшча,Куба, Францыя, Іспанія, Індыя, Нарвегія, Бельгія, Германія, Італія — геаграфія выступленняў гэтых калектываў.

Мы ганарымся і тымі нашымі выпускнікамі, якія працуюць выкладчыкамі Беларускага універсітэта культуры, музычных вучылішчаў рэспублікі, артыстамі Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору імя Г.Цітовіча, Беларускай дзяржаўнай філармоніі, фальклорных гуртоў "Свята", "Купалінка", "Бяседа".

**А.Л.КУЛАКОЎСКАЯ, ст. выкладчык кафедры.**

## Якімі маладымі мы былі!

Гэта задарылася больш як 1О год назад. Як звычайна, 1 верасня 1984 года Мінскі інстытут культуры гасцінна расчыніў свае дзверы перад новым наборам першакурснікаў, у ліку якіх была і я. Для нас, першакурснікаў, пачыналася зусім новае студэнцкае жыццё, поўнае нечаканасцей і падзей, радасцей і смутку, хваляванняў і ўдач.У студэнцкім жыцці ва ўсе часы ёсць залікі, экзамены, сесіі, лекцыі, семінары, практычныя заняткі. Было гэта і у нас. Але, акрамя гэтага, нас чакала вялікая творчая работа на кафедры. Гэта ўсемагчымыя шэфскія канцэрты ў складзе розных аркестраў, прысвечаныя святочным датам, справаздачныя і тэматычныя канцэрты класаў, культпаходы на канцэрты ў філармонію і г.д. Гэтым, здаецца, і засталіся ў памяці студэнцкія гады, праведзеныя на кафедры аркестравага дырыжыравання. Для мяне гады навучання ў інстытуце — новыя сустрэчы і новыя зносіны з цікавымі людзьмі, гэта новыя ўражанні і знаёмствы, новыя сябры, каханне і сям'я.

З таго часу многае змянілася на нашй кафедры. Прыйшлі новыя людзі, цікавыя выкладчыкі, якія маюць свой арыгінальны творчы стыль. Свой прафесійны ўзровень паступова павышаюць "старажылы", аб чым сведчаць навуковыя ступені і званні. Навучальная работа на кафедры значна змянілася, да і сама назва кафедры стала іншай. Лічу, што цяпер студэнты маюць рэальныя магчымасці вывучаць тэндэнцыі сучаснай ансамблева-аркестравай музыкі дастаткова глыбока і дасканала непасрэдна на кафедры. Я вельмі спадзяюся, што ў выніку змен жыць будзе цікавей і выкладчыкам, і цяперашнім студэнтам, якія толькі год праз 10 змогуць па-сапраўднаму ацаніць свае студэнцкія гады.

**МАЛАХАВА І.А., выкладчык кафедры народна-інструментальнай творчасці, канд. пед. навук.**

## Жыццё вядзе за гарызонт...

### *Малітва*

*Даруй нам, Божа, усе грахі,*
*Мы нясем іх цяжкое "брэмя",*
*Мы аддаем жыццю даўгі,*
*Вакол жа нас - глухая цемень.*

*Чаму ж ты, Божа, так зрабіў,*
*Што беларускі люд скарыўся?*
*Навошта нам святло згасіў,*
*А запаліць затым забыўся?*

*Навошта,Божа, з небыцця*
*Выводзіць нас ты больш не хочаш?*
*Няўжо не будзе нам жыцця?*
*І што яшчэ ты нам прарочыш?*

*Чаго жадаеш нам з нябёс?*
*Куды імчалі нашы коні?*
*Мы не заўважылі сябе*
*І адцураліся "Пагоні"...*

*Даруй нам, Божа, усе грахі...*

***В.Спасібенак, выпускніца ФБІС, 1995 г.***

### *Мне жыццё...*

*Мне жыццё ўяўляецца полем*
*Што вядзе аж за гарызонт...*
*То пяшчотай кране, а то болем,*
*То ў рамонкі хісне, то ў асот.*

*То падыме мяне над сабою*
*Можа нават да самых аблок,*
*То прыцягне назад галавою*
*З вышыні ў самы брудны пясок.*

*Падымаюся, зноў крочыць мушу,*
*Недзе мроіцца квецень у полі*
*І калыша бязлітасна душу*
*Уніз - уверх, на раллю - ад раллі.*

*Але што б ні было нам у роспачы,*
*Калі й марыць ужо не з рукі,*
*Пад нагамі на полі я бачу*
*Не калдобы, а больш васількі.*

***Л.А.ДЗЯМЕШКА, прафесар***

### *Падлеткі*

*Хлопчыкі рэжуць бярозу.*
*Так, абыякава, проста.*
*Нібы бялюткія слезы,*
*Падае долу бяроста.*

*Прагна ўпіваюцца ў цела*
*Вострыя джалы сцізоркаў.*
*З сумам жанчына глядзела,*
*Крыўдна было ей і горка.*

*І ў бестурботных падлеткаў*
*Ціха яна так пытае:*
*"Хлопцы, навошта Вы гэтак?*
*Дрэва хіба замінае?*

*Ды з хлапчуковай чародкі*
*Чуецца рэзкі адказ:*
*"Ай, адчапіся ты,цетка,*
*Што табе трэба ад нас?*

*Прэч падаліся хлапчыны*
*Вялай, няспешнай хадою.*
*І ўздыхнула жанчына:*
*"Што ж для вас, дзеткі, святое? "*

***Індэрсон Надзея, студэнтка 401 групы ФЗН***

Адказныя за выпуск:
Р. Ровіна,
М. Іваноў,
А. Данічаў,
Л. Дзямешка.